К ЮБИЛЕЮ КОЛЛЕГИ

Людмила ШЕВЧЕНКО

# СЕРДЦА МОЕГО ЧАСТИЦА

**Лирика разных лет**

---

## МОЙ КРАЙ

Край, где всех начал начало,
Где с рождения живу,
Где зарю свою встречала,
Белой Русью я зову.

Здесь баюкала ребёнком
В колыбели мать меня
И свистели звонко-звонко
Птицы, в майский сад маня.

Здесь, взрослея, по крупицам
Познавала жизни суть.
Сердца моего частица
Тоже здесь, не где-нибудь.

В радости живу иль в грусти,
Всё милей с годами мне
Каждый колос, каждый кустик
На родимой стороне.

# ЗДЕШНЯЯ

Каждой весною в месяце мае
В детства деревню я приезжаю.
Хоть не живу в деревеньке давно,
Просится сердце к ней всё равно.

Всё тут знакомо, дорого, любо.
Шепчут мне травы: – Привет тебе, Люда!
Радостно машет рябина листвой:
– Здравствуй, землячка, со мною постой.

Серые уточки крякают в речке:
– Здесь родились мы, нет лучше местечка.
Скворушки свищут с высокой скворечни:
– Мы, как и ты, здешние, здешние.

Напоминает кустик смородины:
– Тут твоя милая, малая Родина.
Край мой любимый, ты песня чудесная,
Сердце стучит: – Я ведь здешняя, здешняя.
Катятся слёзы счастья безгрешные,
Здесь родилась и навеки я – здешняя.

# БЕЛАРУСКАЙ СТАРОНЦЫ

Колькі вершаў табе прысвяціла!
Колькі слоў для цябе зберагла!
І любоў, і натхненне, і сілы
Безаглядна табе аддала.

Край адзіны, знаёмы да болю
Тут вясёлай, шчаслівай жыла.
Я істотай, і сэрцам з табою,
Я душой да цябе прырасла.

Ты любоўю і лёсам мне стала
Беларуская старана.
Прыгалубіла, зачаравала,
Бо Радзіма, як Маці – адна.

# ЧАКАЮ ВЯСНУ

Я чакаю вясну,
як ніколі раней не чакала,
Пасля шэрых кароткіх дзянькоў
 і настрою няма.
Студзень з лютым прайшлі,
А зімовага ўсё ж не хапала,
Бо без снегу, марозу,
Наогул, зіма – не зіма.

Паратунак – вясна…
Я даўно ўжо сумую па сонцу,
Па квітнеючых белых садах,
Па зялёнай траве.
Будуць птушкі спяваць
Свае звонкія песьні бясконца,
Будуць светлыя мары
Кружыць у маёй галаве.

Прычакаю вясну
І адступяць бяда і самота,
Зорка шчасця ў нябёсах
Заззяе над роднай зямлёй.
Сакавік ля дзвярэй.
Ах, якая ўсё ж асалода,
Зноў душою і сэрцам
Стаць сонечнай і маладой!

# ШЧАСЦЕ

Якое шчасце жыць на белым свеце,
Спеў птушак слухаць, васількі збіраць,
Сачыць, як падрастаюць нашы дзеці,
А з часам сваіх унукаў гадаваць.

Якое шчасце, калі сёння маеш
Сяброў надзейных, хату і радню,
Настрой бадзёры людзям уздымаеш,
Сееш дабро, як зерне у раллю.

Якое шчасце, калі ёсць жаданне
Патрэбным быць, прыгожае тварыць,
З любоўю шчырай і замілаваннем
У вершах пра край родны гаварыць.

Якое шчасце, калі на планеце
Жывуць у згодзе і пануе мір,
Калі спяваюць і смяюцца дзеці,
Бо шчасце самы велічны кумір.

# ЖАДАННІ

Я хачу, каб на нашай планеце
Мір надзейны, спакой панаваў,
Каб спявалі, смяяліся дзеці
І бацькоў кожны з нас шанаваў.

Я жадаю, каб маці-прыроду
Зберагаў і любіў чалавек,
Увайшло б пачуццё гэта ў моду
З нараджэння і на ўвесь век.

Мару я, каб краіны-суседзі
Навучыліся зноў сябраваць,
І ніхто каб на ўсім белым свеце
Не збіраўся ні з кім ваяваць.

Каб людзей не знішчаў, не тыраніў
Жорсткі вірус-кавід на Зямлі,
Каб дарэмна ніхто не параніў
Сэрца сябра свайго да крыві.

А яшчэ, я хацела б, каб шчасце
Пасялілася ў кожнай сям'і,
Каб у душах людзей часта-часта
Заліваліся салаў'і.

# ПТУШЫНЫ КЛІН

Жураўлікі ў нябёсах пралятаюць.
Спяшаюцца на поўдзень, за кардон,
Ды песню развітальную спяваюць
Самотную, цяжкую,нібы стогн.

Курлычуць птушкі, сэрца мне хвалююць,
Слязінкі жалю на вачах маіх.
І землякі па птушачкам сумуюць,
Бо да вясны не будзе з намі іх.

Мы – людзі. Нам патрэбна ўсё жывое:
Звяры і птушкі, пчолкі, матылькі,
Прывычнае, да болю дарагое,
І ружы, і рамонкі ля ракі.

Усё прыносіць радасць і здзіўленне.
Прырода шчодрая. І кожны час
Вясной я адчуваю захапленне,
Калі ляціць птушыны клін да нас.

# ЖЫВУ Ў БЕЛАРУСІ

Жыву у роднай Беларусі,
Дзе свет пазнала і расла.
Радзімай любай ганаруся.
Я тут, як кветачка цвіла.

Няма куточка ў цэлым свеце
Прывабней, даражэй, мілей.
Здаецца, сонейка тут свеціць
Прыветлівей і весялей.

Прырода краю вока цешыць,
Душа спявае нібы птах.
Заўсёды буду я належыць
Краіне, дзе мой родны дах.

Да дзён апошніх не пакіну
Я прынямоння любы кут,
Бо Беларусь – мая Айчына,
І лёс, і шчасце толькі тут.

# МАЛАДОСЦЬ

Ах, маладосць! Час першых дасягненняў,
Кахання, светлых мараў і надзей,
Кароткае, яскравае імгненне
У шэрым ланцужку жыцця людзей.

Калі мы маладыя, нам здаецца,
Вясна прывабней, лета гарачэй,
Ад пачуцця мацней сардэчка б’ецца
І свеціць  сонца у акно ярчэй.

Праходзіць час і моладзь разумее,
Што лёс трымае у сваіх руках
І дзеля шчасця мужна адалее
Памылкі, перашкоды, беды, страх.

Ах, маладосць! Час творчы, непаўторны,
Табе любая справа па плячу.
Калі гляжу ў начное неба зорнае
Зноў ва ўспамінах да цябе лячу.

# СЯБРЫ

Сяброў ніколі не бывае многа.
Жыццё сцвярджае гэта ўсё часцей.
Далёкая, складаная дарога
З сябрамі і лягчэй, і весялей.

Таварыш зразумее, падтрымае,
Няшчасце паспрабуе адвясці,
Ні добрых слоў, ні спраў не забывае
І будзе побач па жыцці ісці.

Заўжды вясёлы, сціплы і надзейны,
Як родны братка, з чыстаю душой,
З дзяцінства разам. Шэпчуць мне падзеі:
– Вы нітачкаю звязаны адной. –

Якое шчасце сябра мець на свеце
Між абыякавых, чужых людзей.
Мы радуемся разам, нібы дзеці,
Спаўненню нашых сонечных надзей.